STRENGTHENING
CIVIL SOCIETY
GLOBALLY



# ІНДЭКС УСТОЙЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ - 2021

## БЕЛАРУСЬ

USAID
FROM THE AMERICAN PEOPLE

ICNL
INTERNATIONAL CENTER
FOR NOT-FOR-PROFIT LAW

fhi360
THE SCIENCE OF IMPROVING LIVES

# ІНДЭКС УСТОЙЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ

# 2021

## КРАІНЫ ЦЭНТРАЛЬНАЙ І ЎСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ І ЕЎРАЗІІ, БЕЛАРУСЬ

**Тэкст падрыхтавалі:**

Агенцтва Злучаных Штатаў Амерыкі па міжнародным развіцці

Бюро па справах дэмакратыі, канфліктаў і гуманітарнай дапамозе

Цэнтр перадавога досведу ў галіне дэмакратыі, правоў чалавека і кіравання

Гэтае выданне падрыхтаванае дзякуючы падтрымцы Агенцтва Злучаных Штатаў Амерыкі па міжнародным развіцці (USAID) у адпаведнасці з Пагадненнем аб супрацоўніцтве № AID-OAA-LA-17-00003.

**Дысклэймер:**
усе меркаванні, выказаныя ў гэтым дакуменце, з'яўляюцца асабістым пунктам гледжання экспертаў, якія ўдзельнічалі ў ацэнцы Індэкса і падрыхтоўцы справаздачы, і не абавязкова адлюстроўваюць кропку гледжання USAID або FHI 360.

# ЗМЕСТ


Прадмова....................3

АГС у краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі ....................5

Устойлівасць АГС Беларусі у 2021 годзе....................23

Прававы асяродак ....................25

Арганізацыйны патэнцыял....................29

Фінансавая ўстойлівасць ....................31

Адвакатаванне....................33

Аказанне паслугаў ....................35

Інфраструктура сектара ....................37

Грамадскі імідж....................40

# ПРАДМОВА

Агенцтва Злучаных Штатаў Амерыкі па міжнародным развіцці (USAID) з задавальненнем прадстаўляе 25-е выданне *Індэкса ўстойлівасці АГС у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе і Еўразіі*, якое ахоплівае падзеі 2021 года ў гэтых краінах. Сёлета выданне паведамляе пра стан сектараў АГС у 23 краінах рэгіёна. Дадаткова рыхтуецца справаздача па Расіі, якая будзе апублікаваная асобна.

На працягу чвэрці стагоддзя Індэкс устойлівасці АГС забяспечвае мясцовыя арганізацыі грамадзянскай супольнасці, урады, донараў, навукоўцаў і іншых асоб важнай інфармацыяй аб тэндэнцыях, якія ўплываюць на ўстойлівасць сектараў АГС у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе і Еўразіі. Дакумент паведамляе аб паляпшэнні ці зніжэнні паказчыкаў па сямі ключавых аспектах або «параметрах» устойлівасці сектара грамадзянскай супольнасці: прававое асяроддзе, арганізацыйны патэнцыял, фінансавая ўстойлівасць, адвакатаванне, аказанне паслугаў, інфраструктура сектара і грамадскі імідж.

Метадалогія Індэкса абапіраецца на дадзеныя, якія прадстаўляюцца практыкамі і даследчыкамі АГС, якія ў кожнай краіне ствараюць экспертную групу для ацэнкі сямі параметраў устойлівасці АГС за год. Экспертная група ўзгадняе балы па кожным параметры ад 1 (устойлівасць высокая) да 7 (устойлівасць нізкая). Затым падлічваецца сярэдняя велічыня па ўсіх выстаўленых балах і атрымліваецца агульны бал устойлівасці АГС у кожнай краіне. Рэдакцыйная калегія, якая базуецца ў ЗША і складаецца з тэхнічных і рэгіянальных экспертаў, рэцэнзуе балы кожнай экспертнай групы і адпаведныя апісальныя справаздачы з мэтай захавання аднастайнасці падыходаў і стандартаў для параўнання сітуацыі ў розных краінах.

Больш падрабязна пра метадалогію, якая выкарыстоўваецца для разліку балаў і складання справаздач, можна даведацца ў поўнай версіі Індэкса на англійскай мове на сайце FHI360.

*Індэкс устойлівасці АГС Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі* дапаўняе аналагічныя публікацыі па іншых рэгіёнах. Рэгіянальныя выданні за 2021 год ацэньваюць сектар грамадзянскай супольнасці ў 73 краінах, у тым ліку ў 32 краінах Афрыкі на поўдзень ад Сахары, 8 ў Азіі, 8 на Блізкім Усходзе і ў Паўночнай Афрыцы, а таксама ў Мексіцы.

Такія публікацыі былі б немагчымыя без удзелу шматлікіх прыватных асоб і арганізацый. Мы асабліва ўдзячныя ўдзельнікам і ўдзельніцам экспертных груп. Менавіта на іх ведах, досведзе, ідэях і назіраннях грунтуецца гэты Індэкс.

Хочацца выказаць асаблівую падзяку кіраўнічцы праекта і супрацоўніцы FHI 360 Эцы Імерлішвілі, рэдактарцы справаздач і супрацоўніцы Міжнароднага цэнтра некамерцыйнага права Джэніфер Сцюарт, а таксама супрацоўніцам USAID Эрын Мак-Карці і Крысціне дэль Касцілья. Поўны спіс падзяк знаходзіцца на старонцы ii.

Прыемнага чытання,



Майкл Кот

Дырэктар Дэпартамента грамадзянскай супольнасці і ўмацавання міру, FHI 360

9 снежня 2022 года

# АГЛЯД СІТУАЦЫІ Ў КРАІНАХ ЦЭНТРАЛЬНАЙ І УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ І ЕЎРАЗІІ Ў 2021 ГОДЗЕ

Індэкс устойлівасці АГС Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі за 2021 год з'яўляецца важнай вяхой, што адзначае чвэрць стагоддзя справаздачнасці аб стане сектара АГС у гэтым рэгіёне. У Індэксе гэтага года паведамляецца аб змяненнях па сямі ключавых параметрах, якія ўплываюць на ўстойлівасць сектара АГС у 23 краінах з розным гістарычным, палітычным і культурным мінулым.

Нягледзячы на тое, што свет кардынальна змяніўся з моманту публікацыі першага выдання Індэкса ўстойлівасці АГС у 1997 годзе, умовы працы арганізацый грамадзянскай супольнасці ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе і Еўразіі ў 2021 годзе заставаліся складанымі. Справаздачы гэтага года паказваюць, што АГС даказалі сваю важнасць, спраўна рэагуючы на пільныя патрэбы грамадства, у тым ліку за кошт далейшага ўкаранення лічбавых інструментаў для паляпшэння сваёй працы. Хоць большасць урадаў у дадзеным рэгіёне прызнаюць важную ролю АГС у грамадстве, ёсць невялікая частка з іх, якая імкнецца нейтралізаваць або дэлегітымізаваць незалежныя АГС, якія крытыкуюць палітыку ўрада і прасоўваюць дэмакратыю і правы чалавека. На жаль, колькасць такіх урадаў працягвае расці.

## ЯШЧЭ АДЗІН СКЛАДАНЫ ГОД

У 2021 годзе арганізацыі грамадзянскай супольнасці ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе і Еўразіі змагаліся з цэлым шэрагам праблем, звязаных з пандэміяй і палітычнай сітуацыяй.

Сёлета вірус COVID-19 працягваў распаўсюджвацца і негатыўна адбівацца на стане здароўя насельніцтва і эканамічных паказчыках, хоць і ў меншай ступені, чым у папярэднім перыядзе. Улады то аслаблялі, то зноў

уводзілі абмежаванні ў адказ на новыя хвалі інфекцый вясной і восенню, але галоўным чынам спрабавалі пазбегнуць поўнага каранціну ва ўмовах нестабільнай эканомікі і грамадскага супраціву надзвычайным мерам. У першым квартале 2021 года ў большасці краін пачалася вакцынацыя, але маштабы гэтых захадаў значна адрозніваліся. Напрыклад, калі да канца года атрымалі прышчэпкі 66% насельніцтва Латвіі, што крыху ніжэй за сярэдні паказчык у 68,8% па Еўрапейскім Саюзе, то доля прышчэпленага насельніцтва ў Балгарыі склала ўсяго 30%, галоўным чынам з-за недакладнай інфармацыі аб вакцыне і дрэнна арганізаваных кампаній па вакцынацыі.

Нягледзячы на частковае аслабленне крызісу ў галіне аховы здароўя, рэгіён перажываў палітычную турбулентнасць і палярызацыю, што часта перашкаджала фарміраванню і рэалізацыі палітыкі і, адпаведна, адвакатыўнай дзейнасці АГС. У 2021 годзе адбыліся агульнанацыянальныя выбары ў Албаніі, Арменіі, Балгарыі, Чэхіі і Малдове. Выбары ў Балгарыі сталі асабліва цікавымі. У дадатак да двух тураў галасавання на прэзідэнцкіх выбарах на працягу года адбыліся тры асобныя кампаніі парламенцкіх выбараў, паколькі пераможцы першых двух кампаній не змаглі сфармаваць урад. Арганізацыі грамадзянскай супольнасці ў краінах, дзе праводзіліся выбары, адукоўвалі выбаршчыкаў, адстойвалі свае платформы разам з кандыдатамі і назіралі за выбарамі.

У іншых краінах, у тым ліку ў Эстоніі, Паўночнай Македоніі, Румыніі і Славакіі, з-за страты грамадскага даверу быў распушчаны ўрад. Напрыклад, у Эстоніі кіруючая кааліцыя распалася ў пачатку года з-за абвінавачванняў у карупцыі. Новы ўрад прызначыў Каю Калас прэм'ер-міністаркай, якая стала першай жанчынай, якая ўзначаліла ўрад краіны.

Асобныя краіны сутыкнуліся з глыбокай палітычнай палярызацыяй. Грузія ўступіла ў 2021 год, знаходзячыся ў цяжкім палітычным крызісе пасля абвінавачванняў у фальсіфікацыі выбараў і байкоту апазіцыяй парламенцкіх выбараў напрыканцы 2020 года. Кульмінацыя палітычных хваляванняў назіралася ў лютым, калі паліцыя ўварвалася ў сядзібу галоўнай апазіцыйнай партыі краіны і затрымала яе старшыню. У красавіку Еўрапейская камісія выступіла пасярэднікам у заключэнні пагаднення аб выхадзе з палітычнага тупіка, але ўжо ў чэрвені кіруючая партыя выйшла з пагаднення, а галоўная

апазіцыйная партыя адмаўлялася яго падпісваць да верасня. Аналагічная сітуацыя адбылася ў Сербіі, дзе ў 2021 годзе кіруючыя партыі атрымалі абсалютную большасць у парламенце, паколькі апазіцыя пераважна байкатавала парламенцкія выбары ў чэрвені 2020 года. Тут Еўрапейскі парламент дапамагаў наладзіць дыялог паміж кіруючай і апазіцыйнай партыямі, але АГС раскрытыкавалі выніковае пагадненне, адзначыўшы, што кіруючая партыя адхіліла прапанову істотных паляпшэнняў выбарчага працэсу. Партыйны тупік таксама значна перашкаджаў палітычным працэсам у Босніі і Герцагавіне і Чарнагорыі.

Сітуацыя ў Беларусі выдзяляецца як асабліва цяжкая. Пасля фальсіфікацыі прэзідэнцкіх выбараў у 2020 годзе і выкліканых гэтым масавых пратэстаў улады прынялі палітыку ўсебаковага падаўлення беларускага грамадства, заглушылі ўсе крытычныя галасы і знішчылі ачагі іншадумства, у тым ліку расправіўшыся з арганізацыямі грамадзянскай супольнасці. На канец 2021 года ў Беларусі налічвалася амаль 1000 зняволеных, прызнаных праваабаронцамі палітычнымі. Паводле некаторых ацэнак, са жніўня 2020 года з краіны з'ехалі каля 200 000 чалавек.

Адносіны паміж краінамі рэгіёна таксама былі напружанымі. У выніку ваеннага канфлікту за тэрыторыю Нагорнага Карабаха, які цягнуўся 44 дні восенню 2020 года, напружанасць паміж Арменіяй і Азербайджанам не аслабела, а цягам 2021 года зарэгістравана некалькі парушэнняў пагаднення аб спыненні агню. Адначасова ў канцы года вырасла напружанасць паміж Украінай і Расіяй, калі апошняя пачала грамадзіць войскі паблізу ўкраінскай граніцы і ў акупаваным Крыме, якія ў лютым 2022 года былі выкарыстаныя для пачатку беспрэцэдэнтнага і разбуральнага ўварвання на тэрыторыю Украіны. Наступствы вайны для сектара АГС у дадзеным рэгіёне будуць разгледжаныя ў выданні Індэкса ўстойлівасці АГС за 2022 год.

Нягледзячы на гэтыя неспакойныя і нярэдка складаныя ўмовы, Індэкс устойлівасці АГС у краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі за 2021 год паказвае аднаўленне грамадзянскай супольнасці пасля беспрэцэдэнтнай напружанасці першага года глабальнай пандэміі COVID-19. У шасці краінах: Чэхіі, Латвіі, Балгарыі, Харватыі, Румыніі і Азербайджане — быў зафіксаваны

рост агульнай устойлівасці АГС, і толькі дзве — Венгрыя і Беларусь — паведамілі пра яе пагаршэнне. Гэта сведчыць аб значным прагрэсе ў параўнанні з сітуацыяй 2020 года, калі толькі дзве краіны паведамілі аб паляпшэнні паказчыкаў агульнай устойлівасці АГС, а тры адзначылі агульнае пагаршэнне. Прычыны росту ўстойлівасці былі разнастайнымі, але сярод найбольш распаўсюджаных чыннікаў былі ўмацаванне грамадскага іміджа і фінансавай устойлівасці.

Сапраўды, паказчыкі па розных параметрах у 2021 вагаліся значна мацней, чым у папярэднія гады. Калі раней асобныя паказчыкі часам змяняліся ў бок падвышэння або паніжэння амаль у палове краін, ахопленых выданнем Індэкса за канкрэтны год, у 2021 годзе найбольш дынамічныя паказчыкі адпавядалі зменам менш чым у траціне даследаваных краін. Напрыклад, у 2020 годзе 12 краін зафіксавалі ўмацаванне інфраструктуры сектара і 11 — арганізацыйнага патэнцыялу, а ў 2021 годзе найбольшая колькасць краін паведаміла аб падобных тэндэнцыях у дачыненні да інфраструктуры сектара і грамадскага іміджу, але толькі сем краін адзначылі падвышэнне абодвух паказчыкаў. Хоць мяркуючы па ацэнках на ўзроўні параметраў цяжка атрымаць выразнае ўяўленне аб сёлетняй сітуацыі, у справаздачах прасочваецца некалькі тэндэнцый.

## АГС АДКАЗВАЮЦЬ НА ПАТРЭБЫ СУПОЛЬНАСЦЕЙ

У 2021 годзе арганізацыі грамадзянскай супольнасці па ўсім рэгіёне прапаноўвалі жыццёва важныя паслугі, забяспечваючы пільныя патрэбы грамадства, такім чынам пацвярджаючы сваю каштоўнасць. Як і ў 2020 годзе, АГС адыгралі важную ролю ў змякчэнні негатыўных наступстваў пандэміі COVID-19 для сваіх супольнасцей. Паводле мэпінга 2021 года ў Грузіі, амаль палова апытаных арганізацый грамадзянскай супольнасці прымалі меры рэагавання на пандэмію і ўдзельнічалі ў распрацоўцы праграм грамадскай аховы здароўя. Арганізацыі грамадзянскай супольнасці па ўсім рэгіёне раздавалі прадуктовыя наборы, сродкі індывідуальнай аховы і медыкаменты, давалі кансультацыі і арганізоўвалі кампаніі па павышэнні дасведчанасці людзей пра вірус і вакцыны. Напрыклад, у жніўні 2021 года арганізацыя Banka

Za Hrana арганізавала маштабную ініцыятыву #WeStandTogether у Паўночнай Македоніі: усяго за адзінаццаць дзён, сумесна з дваццаццю дабрачыннымі арганізацыямі і больш чым 200 валанцёрамі, Banka Za Hrana даставіла 1620 прадуктовых набораў, 6480 масак і 1620 сродкаў дэзінфекцыі сем'ям у дваццаці муніцыпалітэтах краіны. У Чэхіі АГС арганізоўвалі вакцынацыю значна хутчэй, чым гэта атрымлівалася ў дзяржаўных установ.

Арганізацыі грамадзянскай супольнасці таксама распрацавалі новыя паслугі для задавальнення патрэб, што ўзніклі ў сувязі з пандэміяй. У Славеніі з'явілася Прававая сетка ў абарону дэмакратыі (LNPD) для маніторынгу і абароны вяршэнства права ў час прыняцця ўрадам мер рэагавання на COVID-19 і звязаных з імі абмежаванняў. За першы год сваёй працы LNPD накіравала больш за 150 скарг у дзяржаўныя ўстановы, у тым ліку ў пракуратуру; дапамагла падаць больш за пяцьдзесят судовых іскаў супраць дзеянняў і мер урада, а таксама высунуць крымінальнае абвінавачванне супраць урадавага чыноўніка; навучыла валанцёраў весці маніторынг празмернага ўжывання сілы паліцыяй або гвалтоўных дзеянняў пратэстоўцаў. У Чарнагорыі арганізацыя «Бяспечны дом для жанчын» (Safe Women's House) прапаноўвала анлайн-кансультацыі і юрыдычную дапамогу ахвярам гендарна-матываванага гвалту, колькасць якіх глабальна вырасла падчас пандэміі. Латвійская арганізацыя жаночых і мужчынскіх скаўцкіх груп распрацавала новыя праграмы для змяншэння сацыяльнай ізаляцыі моладзі, арганізаваўшы для іх магчымасць спаткацца анлайн і адначасова вучыцца грамадзянскай актыўнасці і каманднай працы.

Арганізацыі грамадзянскай супольнасці таксама спраўна рэагавалі на іншыя патрэбы, што паўставалі ў адпаведных краінах. І ў Арменіі, і ў Азербайджане АГС аказвалі крытычна неабходныя паслугі пасля ваенных дзеянняў у Нагорным Карабаху ў 2020 годзе, у тым ліку гуманітарную, псіхалагічную і юрыдычную дапамогу перамешчаным асобам, людзям, якія страцілі свае дамы, і сем'ям ваеннапалонных, забітых, параненых або зніклых без вестак салдат і мірных грамадзян. У Арменіі многія арганізацыі грамадзянскай супольнасці, якія традыцыйна займаліся пытаннямі правоў чалавека, адвакатавання і празрыстасці ўрада, змянілі напрамак сваёй

дзейнасці, вызначыўшы гуманітарныя прыярытэты і аказваючы паслугі новым групам насельніцтва.

Арганізацыі грамадзянскай супольнасці ў Польшчы і Літве прадэманстравалі сваю гнуткасць у адказ на арганізаваны беларускімі ўладамі гуманітарны крызіс на межах гэтых краін з Беларуссю. Пасля таго, як ЕС і іншыя заходнія краіны ўзмацнілі санкцыі ў дачыненні да Беларусі ў адказ на пашырэнне аўтакратыі ў краіне, беларускі ўрад пачаў заахвочваць мігрантаў, галоўным чынам з Блізкага Усходу, прыязджаць у Беларусь, абяцаючы ім лёгкі шлях у ЕС. У справаздачах таксама адзначалася, што беларускія ўлады накіроўвалі мігрантаў да мяжы, а памежнікі псавалі памежную агароджу, каб дапамагчы ім перайсці на бок Еўрасаюза. Літоўскі Чырвоны Крыж і Літоўскі савет па справах бежанцаў сачылі за становішчам нелегальных мігрантаў, выпускалі справаздачы і выступалі ў абарону правоў мігрантаў, у тым ліку права на адукацыю для іх дзяцей. У Польшчы арганізацыі, якія займаюцца аказаннем дапамогі, абаронай правоў мігрантаў і правоў чалавека, у супрацоўніцтве з сеткай актывістаў хутка арганізавалі сістэму дапамогі тысячам бежанцаў, якія апынуліся ў пастцы на мяжы. Аднак гэтая праца была ўскладненая абвяшчэннем з боку прэзідэнта надзвычайнага становішча ў памежнай зоне ў адказ на наплыў мігрантаў, якое прадугледжвала забарону наведваць гэты раён для СМІ і актывістаў АГС.

Харвацкія арганізацыі грамадзянскай супольнасці працягвалі задавальняць патрэбы ахвяр смяротнага землятрусу магнітудай 6,4, які адбыўся 28 снежня 2020 года і нанёс значны ўрон такім гарадам, як Петрыня, Гліна і Сісак. АГС збіралі адзенне, прадметы гігіены і прадукты харчавання. Платформа псіхалагічнай дапамогі апублікавала на сваім вэб-сайце спіс бясплатных тэлефонных нумароў, якія аказвалі дапамогу і падтрымку, Загрэбскае псіхалагічнае таварыства зняло відэа аб траўме, а Гульнявая асацыяцыя прапаноўвала псіхасацыяльныя паслугі. Акрамя таго, многія АГС супрацоўнічалі ў межах вырашэння праблемы з хатнімі жывёламі, якія сталі бяздомнымі ў выніку землятрусу, у тым ліку шляхам стэрылізацыі сабак і катоў з мэтай прадухілення будучых праблем.

Аднак гэтыя намаганні прывялі да паляпшэння паказчыку аказання паслугаў толькі ў чатырох краінах: Літве, Румыніі, Малдове і Азербайджане. Прытым у пераважнай большасці краінаў — сямнаццаці — ніякіх змен не адбылося. У дадатак да пашырэння спектру паслуг і ахопу новых груп насельніцтва, пра якое паведамлялася ва ўсіх чатырох краінах, аказанне паслуг АГС у Літве і Малдове атрымала новы імпульс дзякуючы павышэнню зацікаўленасці ўрада ў сацыяльнай замове на паслугі АГС.

У Беларусі ў 2021 годзе ўрад распачаў узгодненую кампанію па ліквідацыі АГС. Хоць гэта прывяло да значнага скарачэння прапановы паслуг з боку арганізацый грамадзянскай супольнасці, сектар АГС пачаў аказваць новыя паслугі для абароны грамадскіх арганізацый: юрыдычныя кансультацыі, псіхалагічныя паслугі, мерапрыемствы па развіцці патэнцыялу, прытулкі і стажыроўкі для праваабаронцаў, журналістаў, актывістаў і работнікаў культуры. Большая частка гэтых паслуг аказвалася арганізацыямі грамадзянскай супольнасці за межамі краіны, але прызначалася для людзей і арганізацый, якія засталіся ў Беларусі. АГС таксама аказвалі паслугі новай мэтавай групе: вялікай колькасці беларусаў, што выехалі з краіны. У краінах, дзе пасяліліся беларусы, у тым ліку ў Польшчы і Літве, АГС стварылі цэнтры падтрымкі, інтэграцыйныя і культурныя праграмы, напрыклад, Беларускую нядзельную школу для дзяцей у Вільні.

Эфектыўнае рэагаванне арганізацый грамадзянскай супольнасці на пандэмію і іншыя пільныя патрэбы грамадства часта прыводзіла да павышэння прызнання сектара ў грамадстве, што адбілася на паляпшэнні параметра «Грамадскі імідж». Грамадскі імідж сектара вырас у сямі краінах: Чэхіі, Латвіі, Балгарыі, Румыніі, Азербайджане, Малдове і Украіне. У Латвіі гэты паказчык нязначна палепшыўся дзякуючы больш шырокаму прызнанню ключавой ролі АГС у рэагаванні на пандэмію і ліквідацыі яе наступстваў. Паляпшэнне грамадскага іміджа сектара ў Азербайджане, Малдове, Румыніі і Украіне таксама было абумоўлена (прынамсі часткова) роляй АГС у рэагаванні на пандэмію і іншыя пільныя грамадскія патрэбы.

Пазітыўнае прызнанне з боку грамадства важнай ролі АГС у задавальненні грамадскіх патрэб назіралася і ў іншых краінах, нават калі гэта

не прывяло да змены паказчыка грамадскага іміджа. Напрыклад, у справаздачы па Босніі адзначаецца, што, мяркуючы па ўсім, грамадскае ўспрыманне арганізацый грамадзянскай супольнасці палепшылася ў апошнія гады, паколькі АГС часта першымі рэагавалі на новыя патрэбы грамадства падчас пандэміі. У Арменіі грамадскі імідж АГС палепшыўся ў выніку іх сістэматычнай працы па вырашэнні гуманітарных праблем. У Славакіі некалькі кампаній, ініцыяваных арганізацыямі грамадзянскай супольнасці ў адказ на пандэмію, дапамаглі палепшыць імідж сектара, які прадэманстраваў гнуткасць і гатоўнасць АГС аказваць дапамогу. Даследаванне, праведзенае ў Польшчы, паказала, што грамадскі імідж АГС і прызнанне іх ролі выраслі ў 2021 годзе дзякуючы бесперапыннаму асвятленню іх дзейнасці незалежнымі СМІ, асабліва ў кантэксце пандэміі і крызісу на граніцы з Беларуссю. Падобным чынам, у Сербіі АГС былі больш прыкметнымі ў 2021 годзе дзякуючы іх дзейнасці па вырашэнні бягучых сацыяльна-палітычных пытанняў, у тым ліку праблем беднасці і экалогіі. Аднак у многіх з гэтых краін пазітыўныя змены былі зведзеныя на нішто дэзінфармацыяй і рытарычнымі нападкамі на сектар, у тым ліку з боку ўрада і падпарадкаваных яму або звязаных з ім сродкаў масавай інфармацыі, што перашкаджала паляпшэнню паказчыкаў па гэтым параметры.

## АГС УКАРАНЯЮЦЬ ЛІЧБАВЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ

Пад уплывам новай рэальнасці, выкліканай пандэміяй COVID-19, арганізацыі грамадзянскай супольнасці рэгіёна ў 2020 і 2021 гадах усё часцей пераводзілі сваю працу ў лічбавую форму, удасканальваючы некаторыя аспекты сваёй дзейнасці.

Паколькі абумоўленыя пандэміяй абмежаванні пазбавілі АГС магчымасці асабіста ўзаемадзейнічаць са сваімі мэтавымі групамі, арганізацыі грамадзянскай супольнасці часцей выкарыстоўвалі лічбавыя інструменты, у тым ліку сацыяльныя сеткі, для падтрымання і наладжвання адносін з зацікаўленымі ў іх дзейнасці асобамі. Гэта спрыяла паляпшэнню арганізацыйнага патэнцыялу ў некалькіх краінах, у тым ліку Арменіі, Косаве і Славеніі. У справаздачы па Славеніі адзначаецца, што больш шырокае

выкарыстанне арганізацыямі грамадзянскай супольнасці новых лічбавых сродкаў камунікацыі палепшыла іх сувязі з атрымальнікамі паслуг і дазволіла ім далей адаптаваць свае дзейнасць і паслугі да абумоўленых пандэміяй абставін. Падобныя тэндэнцыі таксама назіраліся ў іншых краінах (хоць і не прывялі да змен паказчыка арганізацыйнага патэнцыялу), у тым ліку ў Албаніі, дзе выкарыстанне лічбавых інструментаў дазволіла АГС прыцягваць атрымальнікаў паслуг да распрацоўкі і ажыццяўлення праектнай дзейнасці. Напрыклад, на працягу 2021 года Албанская сетка па развіцці сельскай мясцовасці (ANRD) правяла кансультацыі з 500 мясцовымі стэйкхолдарамі, каб распрацаваць і адвакатаваць новую палітыку кіравання сельскім сектарам. У Венгрыі арганізацыі грамадзянскай супольнасці распрацавалі магчымасці падтрымліваць сувязь са сваімі сябрамі і прыхільнікамі і прыцягваць новых праз інтэрнэт, у тым ліку праз інфармацыйныя рассылкі і сацыяльныя сеткі.

Аднак аўтары справаздач па Малдове і Чэхіі адзначалі абмежаванні выкарыстання лічбавых інструментаў для ахопу пэўных груп насельніцтва, асабліва сталых людзей, бедныя сем'і і людзей з інваліднасцю, што перашкаджае АГС, якія працуюць з гэтымі групамі, патдрымліваць з імі кантакт.

Шырокае выкарыстанне арганізацыямі грамадзянскай супольнасці сацыяльных сетак таксама спрыяла павышэнню іх пазнавальнасці ў грамадстве. У справаздачах па Албаніі, Арменіі, Чэшскай Рэспубліцы, Грузіі, Косаве, Малдове, Польшчы, Румыніі і Сербіі адзначалася, што цягам года арганізацыі грамадзянскай супольнасці спраўней выкарыстоўвалі сацыяльныя сеткі і іншыя лічбавыя інструменты для павышэння сваёй пазнавальнасці. У Румыніі, напрыклад, узрасла прысутнасць АГС у Інтэрнэце, а іх імкненне паведамляць аб сваёй працы і выніках у 2021 годзе стымулявалі прызнанне ўкладу грамадскага сектара з боку прадстаўнікоў бізнесу і дзяржаўных структур.

Карыстанне арганізацыямі грамадзянскай супольнасці лічбавымі інструментамі таксама дапамагло ім адаптавацца да механізмаў дыстанцыйнай працы, да якіх змусіла пандэмія. На працягу 2021 года АГС рэгіёна эфектыўна выкарыстоўвалі такія платформы, як Zoom, Microsoft Teams

і Slack, для кіравання сваёй дзейнасцю і арганізацыі ўнутраных і знешніх сустрэч, дыскусій і трэнінгаў.

Больш шырокае выкарыстанне лічбавых інструментаў таксама спрыяла развіццю краўдфандынга ў рэгіёне. eCrowd, першая краўдфандынгавая платформа для АГС у Паўночнай Македоніі была запушчана ў 2021 годзе, што дазволіла некалькім ініцыятывам цягам года атрымаць падтрымку. Напрыклад, ініцыятыва «Падары камп'ютар» сабрала дастаткова сродкаў, каб купіць машыну для збору ўжываных камп'ютараў на тэрыторыі ўсёй краіны, каб пазней іх адрамантаваць і перадаць асобам з уразлівых супольнасцей. У Славеніі арганізацыя «Сёння новы дзень» (DJND) запусціла новую краўдфандынгавую платформу пад назвай Huda pobuda («Сур'ёзная ініцыятыва»). У першым цыкле для атрымання сродкаў на платформе былі адабраныя тры ініцыятывы. Грузінская Orbeliani — гэта краўдфандынгавая платформа, якая хутка расце і падтрымлівае праекты з вядучым удзелам супольнасцей. У Арменіі калабарацыйная платформа ReArmenia паспяхова прыцягвала сродкі праз краўдфандынгавыя анлайн-платформы і выкарыстоўвала іх для падтрымкі інавацыйных праектаў. Арганізацыі грамадзянскай супольнасці таксама пачалі дадаваць раздзелы для заахвочвання ахвяраванняў на свае вэб-сайты. У некаторых краінах краудфандынг ужо некалькі гадоў быў папулярным спосабам збору сродкаў, і эфектыўнасць гэтых механізмаў працягвала расці на працягу 2021 года. Напрыклад, у Славакіі праз платформу DARUJME.sk у 2021 годзе сабралі больш за 4 мільёны еўра, а гэта значна пераўзыходзіць суму 3,1 мільёна еўра ў 2020 годзе і паказчык 1,6 мільёна еўра ў 2019 годзе.

Больш шырокае выкарыстанне тэхналогій таксама спрыяла развіццю інфраструктуры, якая падтрымлівае сектар АГС у шэрагу краін, у прыватнасці, за кошт пашырэння доступу да рэсурсаў для нарошчвання патэнцыялу. Напрыклад, у Польшчы доступ да тэхналогій дазволіў АГС удзельнічаць у трэнінгах, семінарах і анлайн-сустрэчах у рэжыме рэальнага часу, што дапамагло знізіць кошт такіх трэнінгаў і пашырыць магчымасць запрашаць экспертаў з Польшчы і іншых краін. У справаздачах па Балгарыі і Малдове таксама адзначаецца падвышэнне даступнасці навучання, якое пераважна

праводзілася анлайн, што спрыяла паляпшэнню інфраструктуры сектара АГС у гэтых краінах цягам года.

У іншых справаздачах таксама паведамлялася пра пашырэнне магчымасцей анлайн-навучання ў 2021 годзе. Аўтары справаздачы па Арменіі падкрэсліваюць, што рост цыфравізацыі сектара дазволіў АГС шукаць новыя магчымасці для нарошчвання патэнцыялу ў віртуальнай сферы, акрамя даступных у краіне. Падобным чынам, арганізацыі грамадзянскай супольнасці ва Украіне карысталіся бясплатнымі анлайн-курсамі на платформах Coursera, Prometheus і EdEra па кіраванні некамерцыйнымі арганізацыямі, правах чалавека і грамадзянскай адукацыі. Аднак адзначаліся і абмяжаванні ў эфектыўнасці анлайн-навучання. Напрыклад, у Літве выкліканы пандэміяй першапачатковы энтузіязм да карыстання перавагамі віртуальных рашэнняў згас, і арганізатарам было цяжка прыцягваць удзельнікаў на свае анлайн-трэнінгі. У некалькіх справаздачах адзначаецца, што анлайн-трэнінгі і кансультацыі часам менш эфектыўныя за мерапрыемствы з фізічнай прысутнасцю.

Сітуацыя ў Беларусі была ў пэўным сэнсе анамальнай з пункту гледжання выкарыстання лічбавых інструментаў. Сутыкнуўшыся з шырокамаштабнымі рэпрэсіямі, многія беларускія АГС спынілі актыўныя зносіны са сваімі мэтавымі групамі і закрылі вэб-сайты і старонкі ў сацыяльных сетках, каб пазбегнуць непажаданай увагі з боку ўладаў. Аднак некаторыя арганізацыі працягвалі камунікацыю праз сацыяльныя сеткі, часта ў закрытых (непублічных) фарматах. Адначасна некаторыя арганізацыі грамадзянскай супольнасці, што працуюць з-за мяжы, развілі свае каналы камунікацыі ў сацыяльных сетках. Напрыклад, у Тэлеграм-канала Праваабарончага цэнтра «Вясна» на канец года было больш за 13 000 падпісчыкаў.

## НЕАДНАЗНАЧНЫЯ ТЭНДЭНЫІ Ў ПРАВАВЫМ АСЯРОДДЗІ

У 2021 годзе ў прававым і нарматыўным асяроддзі, якое рэгулюе сектар АГС у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе і Еўразіі, назіраліся супярэчлівыя тэндэнцыі. Шэсць краін адзначылі паляпшэнні ў параметры «Прававое асяроддзе», але столькі ж краін паведамілі аб пагаршэнні гэтага паказчыка. За

некаторымі выключэннямі, такія змены ў ацэнках у значнай ступені адлюстроўваюць рост разрыву паміж краінамі, урады якіх падтрымліваюць АГС, і тымі, дзе незалежныя галасы намагаюцца заглушыць.

У 2021 годзе прававое асяроддзе, якое рэгулюе дзейнасць АГС, палепшылася ў Чэхіі, Балгарыі, Косаве, Паўночнай Македоніі, Азербайджане і Украіне. Большасць са згаданых краін па гэтым параметры займаюць верхнія радкі спіса па рэгіёне, а нязначныя паляпшэнні ў 2021 годзе, верагодна, дэманструюць, што ўрады гэтых дзяржаў па-ранейшаму прызнаюць і падтрымліваюць ролю АГС у грамадстве. Напрыклад, прававая база ў Чэхіі спрашчае рэгістрацыю і дзейнасць АГС і ўтрымлівае палажэнні, што заахвочваюць дабрачыннасць за кошт зніжэння базы падаходнага падатку прыватным донарам, якія ахвяруюць на грамадскія патрэбы. У 2021 годзе ацэнка прававога асяроддзя Чэхіі трохі палепшылася за кошт павышэння парога дапушчальных падатковых вылікаў. Прававое асяроддзе, якое рэгулюе дзейнасць АГС у Паўночнай Македоніі і Украіне, у 2021 годзе палепшылася пасля прыняцця ўрадавых стратэгій развіцця грамадзянскай супольнасці і іншых сумежных сфер. У Косаве і без таго спрыяльнае прававое асяроддзе для грамадскага сектара стала крыху больш прадказальным, бо адпаведна вырас узровень выканання ўрадам патрабаванняў, якія тычацца крытэрыяў фінансавання АГС, публікацыі абвестакі ацэнак камісій. Заняўшы чацвёрты радок сярод лепшых балаў па гэтым параметры ў рэгіёне, Балгарыя палепшыла прававое асяроддзе ў 2021 годзе, паколькі ў выніку змены ўрада адсутнічалі выпадкі пераследу з боку дзяржавы, аб якіх паведамлялася ў папярэднія гады.

Азербайджан стаў відавочным выключэннем з гэтай тэндэнцыі. Хоць у 2021 годзе паказчык прававога асяроддзя там палепшыўся, у Азербайджане па-ранейшаму адзін з найменш спрыяльных прававых кліматаў для грамадзянскай супольнасці не толькі ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе і Еўразіі, але і ва ўсіх 73 краінах свету, ахопленых Індэксам устойлівасці 2021 года. У 2021 годзе прававое асяроддзе для АГС у Азербайджане крыху палепшылася пасля запуску вэб-партала, які дазваляе АГС змяняць свае рэгістрацыйныя дакументы і рэгістраваць атрыманыя фінансавыя сродкі. Тым

не менш, АГС па-ранейшаму працавалі ў надзвычай бюракратычных і абмежавальных умовах, а палітычныя і грамадзянскія актывісты, журналісты і грамадзяне, якія выказваюць крытычныя да ўлад меркаванні, сістэматычна сутыкаюцца з крымінальным пераследам і запалохваннем.

Шэсць краін: Беларусь, Венгрыя, Сербія, Польшча, Албанія і Грузія — паведамілі пра пагаршэнне прававога асяроддзя для сектара АГС у 2021 годзе. У чатырох з гэтых краін урады імкнуцца кантраляваць ці заглушыць незалежныя галасы. Беларусь — крайні прыклад такога кантролю. У 2021 годзе ўрад краіны пачаў праводзіць мэтанакіраваную палітыку па ўстанаўленні поўнага дзяржаўнага кантролю над сектарам АГС, у выніку чаго ацэнка прававога асяроддзя склала 7,0 балаў, што з'яўляецца самым нізкім паказчыкам па шкале Індэкса. Сотні АГС страцілі прававы статус, міліцыя правяла шматлікія рэйды супраць арганізацый грамадзянскай супольнасці і звязаных з імі асоб. Палітычныя лідэры краіны адкрыта казалі пра свой намер ачысціць краіну ад «шкодных» арганізацый. Гэтыя дзеянні прывялі да масавага пераезду лідэраў і актывістаў АГС ў іншыя краіны. Паказчык прававога асяроддзя ў Беларусі ў 2021 годзе рэзка пагоршыўся. Аднак, паколькі ацэнка за 2020 год ужо складала 6,9, яе можна было знізіць толькі на адну дзясятую да 7,0, што, згодна з правіламі ацэнкі Індэкса, звычайна азначае невялікае пагаршэнне.

Грамадзянская прастора ў Венгрыі, якая некалі лічылася стабільнай дэмакратыяй, пачала рэзка прыходзіць у заняпад пачынаючы з 2010 года, калі да ўлады прыйшоў урад на чале з прэм'ер-міністрам Віктарам Орбанам з правацэнтрысцкай партыі «Фідэс». Прававое асяроддзе, якое рэгулюе дзейнасць венгерскіх АГС, зноў пагоршылася ў 2021 годзе ў выніку намеру ўрада прыняць абмежавальнае заканадаўства. Парламент у рэшце рэшт адклікаў сумна вядомы Закон 2017 года аб арганізацыях, фінансаваных з-за мяжы, які стыгматызаваў АГС на падставе крыніц фінансавання, але адначасова прапанаваў новы закон, які рэгулюе дзейнасць арганізацый, «здольных уплываць на грамадскае жыццё», з аналагічнымі хвалюючымі палажэннямі. Акрамя таго, апублікаваная ў чэрвені пастанова ўрада абавязвала ўсе АГС пазначаць у сваіх справаздачах імёны прыватных донараў,

фактычна забараняючы ананімныя ахвяраванні. Варта адзначыць, што пастанову адклікалі праз некалькі тыдняў пасля публікацыі. Тым часам дзяржаўны пераслед АГС працягваўся ў розных формах: нагляд, дзяржаўная прапаганда, штрафы і публічныя паклёпніцкія кампаніі.

Сербія і Польшча прадэманстравалі падобныя тэндэнцыі ў трохі іншай ступені. Прававое асяроддзе ў Сербіі ў 2021 годзе зноў пагоршылася — сёмы год запар. Прычынай пагаршэння гэтага паказчыка ў 2021 годзе стаў пераслед АГС з боку дзяржавы, у тым ліку ў форме працяглых фінансавых праверак, а таксама пагрозы і гвалт з боку хуліганскіх груп, меркавана звязаных з кіруючай партыяй. Апрача таго, Міністэрства ўнутраных спраў часта забараняла грамадзянскія сходы, абвінавачвала актывістаў у здзяйсненні правапарушэнняў і штрафавала за іх. Спрыяльнасць прававога асяроддзя ў Польшчы, хоць і застаецца сярод найбольш развітых краін па гэтым паказчыку, падае ўжо пяты год запар, паколькі папулісцкі ўрад прапанаваў шэраг заканадаўчых змен, якія паставяць АГС пад узмоцнены кантроль урада. Апрача таго, дзяржаўныя ўстановы ўсё часцей звяртаюцца да нападак і пераследу АГС і грамадзянскіх актывістаў, асабліва ў кантэксце гуманітарнага крызісу на польска-беларускай мяжы.

Нягледзячы на тое, што прававое асяроддзе, якое рэгулюе дзейнасць АГС у Славеніі, не змянілася, сфарміраваны ў сакавіку 2020 года правы ўрад распачаў дзеянні па падрыве вяршэнства закона і дэмакратычных інстытутаў, у тым ліку СМІ і судовай сістэмы. Гэта сведчыць аб тым, што ўлады могуць пайсці па тым жа шляху, што і вышэйзгаданыя краіны. На працягу года многія славенскія АГС паведамлялі пра страх помсты за іх праваабарончую дзейнасць і крытыку ўрада ў выглядзе мэтавых праверак, публічных паклёпніцкіх кампаній і іншых форм пераследу.

## РЭГІЯНАЛЬНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ ЎСТОЙЛІВАСЦІ АГС

23 краіны, ахопленыя гэтым выданнем Індэкса ўстойлівасці АГС, папярэднейшаму моцна адрозніваюцца. Як і ў мінулыя гады, у 2021 годзе сярэднія паказчыкі ўстойлівасці АГС пераважна знізіліся ў рэгіянальным і субрэгіянальным разрэзе.

## Паўночная група




Наогул, краіны Паўночнай групы (краіны Балтыі і Вышаградскай групы) па-ранейшаму могуць пахваліцца самымі высокімі агульнымі паказчыкамі ўстойлівасці АГС, прычым сем з васьмі краін у гэтым субрэгіёне атрымалі балы, якія адносяцца да вышэйшай катэгорыі ўстойлівасці: «Высокая ўстойлівасць». Эстонія па-ранейшаму мае самы высокі ўзровень сектарнай устойлівасці не толькі ў Індэксе ўстойлівасці АГС у краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі, але і выданнях Індэкса ўстойлівасці АГС па іншых рэгіёнах. АГС у Эстоніі, як і ў большасці іншых краін Балтыі і Вышаградскай групы, працуюць у спрыяльным прававым асяроддзі, валодаюць значным арганізацыйным патэнцыялам і вядуць актыўнае адвакатаванне і аказанне паслугаў.

Нягледзячы на тое, што фінансавая ўстойлівасць застаецца адным з самых слабых параметраў, АГС у гэтых краінах маюць доступ да адносна разнастайных крыніц фінансавання, у тым ліку дзяржаўных грантаў і кантрактаў, прыватных і карпаратыўных ахвяраванняў, а таксама адлічэння часткі падаткаў на дзейнасць АГС; замежныя донары, як правіла, выступаюць адносна нязначнымі крыніцамі фінансавання сектара АГС у гэтых краінах. Венгрыя мае самы нізкі ўзровень устойлівасці АГС сярод краін Паўночнай

групы і з'яўляецца адзінай краінай гэтага субрэгіёна, дзе паказчык устойлівасці адносіцца да сярэдняй катэгорыі — «Устойлівасць нестабільная». Як апісана вышэй, венгерскія АГС працуюць у непрыязным асяроддзі, у якім яны практычна не могуць уплываць на прыняцце дзяржаўных рашэнняў і рэгулярна вымушаны змагацца з паклёпніцкімі кампаніямі.

У 2021 годзе Чэхія і Латвія палепшылі свае і без таго высокія паказчыкі агульнай устойлівасці. Дзякуючы такому росту гэтыя дзве краіны дагналі Літву і падзялілі з ёй другое месца па паказчыку ўстойлівасці ў рэгіёне (і сярод іншых краін, ахопленых сёлетнім выданнем Індэкса). Калі ў Чэхіі рост устойлівасці АГС быў абумоўлены пазітыўнымі зменамі ў прававым асяроддзі, фінансавай устойлівасці і грамадскім іміджы, у Латвіі прыкметныя паляпшэнні ў фінансавай устойлівасці і грамадскім іміджы сектара пераважылі нязначныя. зніжэнні паказчыкаў па адвакатаванні і інфраструктуры сектара.

## Еўразія

З іншага боку, АГС у Еўразіі ўвогуле маюць найнізшы ўзровень устойлівасці сярод краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі. Беларусь і Азербайджан зноў аказаліся адзінымі дзвюма краінамі ў гэтым выданні Індэкса з агульнымі ацэнкамі ўстойлівасці АГС у самай нізкай катэгорыі ўстойлівасці – «Устойлівасць нізкая». Улічваючы значнае пагаршэнне агульнага ўзроўню ўстойлівасці АГС у Беларусі і нязначнае яго паляпшэнне ў Азербайджане, гэтыя дзве краіны цяпер падзяляюць самы нізкі радок па агульных паказчыках устойлівасці АГС не толькі ў краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Еўразіі, але і сярод усіх краін у іншых рэгіянальных выданнях Індэкса. Ва ўмовах поўнамаштабнай вайны ўрада супраць грамадзянскай супольнасці ў Беларусі зафіксавана пагаршэнне па кожным параметры ўстойлівасці АГС, прычым па большасці параметраў спад склаў 0,3 і больш бала. У Азербайджане, наадварот, зафіксаваныя нязначныя паляпшэнні ў такіх параметрах, як прававое асяроддзе, фінансавая ўстойлівасць і грамадскі імідж. З іншага боку, АГС ва Украіне маюць адносна высокі ўзровень устойлівасці: усяго крыху ніжэй, чым у большасці краін Паўночнай групы.




## Паўднёвая група

Паказчык агульнай устойлівасці АГС у Паўднёвай групе (Паўднёва-Усходняя Еўропа) знаходзіцца недзе пасярэдзіне паміж астатнімі двума субрэгіёнамі. Агульная ацэнка ва ўсіх дзевяці краінах гэтага субрэгіёна па-ранейшаму адносіцца да катэгорыі «Устойлівасць нестабільная». Харватыя мае самы высокі ўзровень устойлівасці АГС сярод краін Паўднёвай групы. Літаральна трошкі адстае Балгарыя, а вось Сербія мае найнізшы агульны бал.

Тры краіны Паўднёвай групы паведамілі аб паляпшэнні ацэнкі агульнай устойлівасці АГС у 2021 годзе. Агульны бал Балгарыі палепшыўся ў выніку росту па трох параметрах. Новы ўрад, сфармаваны ў канцы года, быў больш адкрыты для працы з АГС, што спрыяла паляпшэнню прававога асяроддзя і грамадскага іміджу. Таксама развівалася інфраструктура сектара, паколькі АГС атрымалі больш шырокі доступ да трэнінгаў і часцей наладжвалі паміж сабой партнёрскія адносіны. У Румыніі рост мясцовых ахвяраванняў і замежнага фінансавання садзейнічаў умеранаму паляпшэнню фінансавай устойлівасці, што ў сваю чаргу выклікала нязначны рост арганізацыйнага патэнцыялу і аказання паслуг.

Інфраструктура сектара АГС таксама крыху палепшылася ў 2021 годзе за кошт пашырэння супрацоўніцтва ўнутры сектара, а дзякуючы росту ахопу і пазнавальнасці АГС у інтэрнэце палепшыўся грамадскі імідж. У Харватыі

агульная ўстойлівасць узмацнілася ў выніку пазітыўных змен у адным параметры: інфраструктура сектара палепшылася дзякуючы росту супрацоўніцтва ў сектары.




Албанія, з іншага боку, стала адзінай краінай Паўднёвай групы, у якой у 2021 годзе было зафіксавана пагаршэнне агульнай устойлівасці АГС. Прававое асяроддзе крыху пагоршылася з-за некалькіх зменаў у заканадаўчай базе, якая рэгулюе дзейнасць АГС, а працяглыя абмежаванні на правядзенне сходаў, недастатковая празрыстасць і адсутнасць магчымасцей для кансультацый з урадам падарвалі адвакатыўныя высілкі АГС. Апрача таго, грамадскі імідж сектара АГС трохі пагоршылася ў выніку пастаянных нападак на АГС і актывістаў з боку ўрада і падкантрольных яму СМІ.

# УСТОЙЛІВАСЦЬ АРГАНІЗАЦЫЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ БЕЛАРУСІ - 2021

## АГУЛЬНАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ АГС: 5.8 (2020: 5.5)




У 2021 годзе палітычны крызіс у Беларусі ўзмацніўся, а крызісная сітуацыя з правамі чалавека яшчэ больш пагоршылася. Сфальсіфікаваныя прэзідэнцкія выбары 2020 года і выкліканыя гэтым пратэсты прывялі да рэпрэсій супраць грамадзянскай супольнасці, якія працягнуліся ў 2021 годзе. Напрыканцы года ў Беларусі налічвалася 969 палітычных зняволеных. У сярэдзіне 2021 года ўрад распачаў кампанію па ліквідацыі грамадскіх арганізацый. Цягам года больш за 300 арганізацый грамадзянскай супольнасці былі ліквідаваныя або знаходзіліся ў працэсе прымусовай ліквідацыі. Яшчэ некалькі соцень вырашылі пачаць працэс ліквідацыі самастойна. Улады таксама актыўна пераследавалі журналістаў. Па дадзеных Беларускай асацыяцыі журналістаў, цягам 2021 года 32 работнікі СМІ апынуліся за кратамі, 113 журналістаў былі затрыманыя, агулам 146 вобыскаў прайшлі ў дзясяткаў журналістаў і ў мностве рэдакцый. Па некаторых ацэнках, рэпрэсіўныя абставіны прывялі да таго, што, пачынаючы са жніўня 2020 года, каля 200 000 чалавек з'ехалі з Беларусі.

У гэтым складаным кантэксце ўстойлівасць АГС у 2021 годзе значна знізілася. Прадстаўнікі АГС сутыкаліся з вобыскамі, арыштамі, допытамі і крымінальным пераследам, арганізацыі нематывавана пазбаўляліся рэгістрацыі, канфіскоўваліся абсталяванне і дакументы, блакаваліся банкаўскія рахункі. Дзяржаўныя СМІ разгарнулі прапагандысцкую кампанію супраць грамадзянскай супольнасці, у межах якой у адрас АГС выкарыстоўваліся мова варожасці, іх абвінавачвалі ў змове. Многія арганізацыі і актывісты мусілі з'ехаць з краіны. У выніку сёння беларуская грамадзянская супольнасць адкрыта дзейнічае пераважна за межамі краіны.

Многія АГС, якія засталіся ў краіне, спынілі або прыпынілі сваю дзейнасць, іншыя перасталі дзейнічаць публічна. АГС былі вымушаныя пастаянна мяняць свае планы, прыярытэты і віды дзейнасці і засяроджвацца на выжыванні арганізацыі, а не на развіцці патэнцыялу. Істотна скараціўся доступ да мэтавых групаў, асабліва для арганізацый грамадзянскай супольнасці, якія аказваюць паслугі ўразлівым супольнасцям. АГС у Беларусі страцілі прастору для вядзення адвакатыўнай дзейнасці. У той жа час, нягледзячы на беспрэцэдэнтны ўзровень рэпрэсій, асабістую рызыку і аперацыйныя праблемы беларускія АГС працягваюць дзейнічаць як унутры краіны, так і ў выгнанні, намагаючыся палепшыць сітуацыю ў Беларусі.

Па стане на 1 студзеня 2022 года ў Беларусі было зарэгістравана 2978 грамадскіх аб'яднанняў (у тым ліку 226 міжнародных, 785 нацыянальных і 1967 мясцовых асацыяцый), 227 фондаў, 25 прафсаюзаў, 45 саюзаў грамадскіх аб'яднанняў і некалькі соцень некамерцыйных устаноў. Сотні АГС былі ліквідаваныя ў 2021 годзе, аднак большасць з іх да канца года не завяршылі працяглы працэс ліквідацыі і таму ўключаныя ў гэтую статыстыку. У 2021 годзе было зарэгістравана толькі 36 новых грамадскіх аб'яднанняў — гэта самы нізкі паказнік новых рэгістрацый за апошняе дзесяцігоддзе. Адначасна АГС актыўна рэгістраваліся ў Літве, Польшчы, Грузіі, Украіне і іншых краінах.

## ПРАВАВЫ АСЯРОДАК: 7.0 (2020: 6.9)

ПРАВАВЫ АСЯРОДАК У БЕЛАРУСІ




У 2021 годзе паказчык прававога асяроддзя, якое рэгулюе дзейнасць АГС у Беларусі, знізіўся да найгоршага магчымага па шкале ацэнкі Індэкса ўстойлівасці АГС, паколькі дзяржава праводзіла шматбаковую палітыку па падаўленні беларускага грамадства і заглушэнні ўсіх крытычных галасоў або супольнасцяў іншадумства. Хаця паказчык адлюстроўвае нібыта нязначнае пагаршэнне ў параўнанні з 2020 годам у адпаведнасці з метадалогіяй ацэнкі Індэкса, сітуацыя рэзка пагоршылася, паколькі палітыка ўрада была скіраваная на тое, каб паставіць сектар АГС пад поўны дзяржаўны кантроль. Сотні АГС страцілі прававы статус, былі праведзеныя шматлікія рэйды супраць арганізацый і асоб, звязаных з імі. Улады адкрыта казалі пра свой намер ачысціць краіну ад «паскудных» арганізацый. Гэтыя дзеянні прывялі да масавага пераезду лідэраў і актывістаў АГС ў іншыя краіны.

Для адмовы ў рэгістрацыі АГС дзяржаўныя органы прыцягваюць шырокія прававыя падставы, і заявы аб рэгістрацыі звычайна адхіляюцца. Адначасна рэгістраваць арганізацыю ў 2021 годзе у такой неспрыяльнай атмасферы і пад рызыкай рэпрэсій стала небяспечна і страшна для АГС, і таму было пададзена менш новых заявак на рэгістрацыю, чым за ўвесь час існавання суверэннай Беларусі.

Улады пачалі мэтанакіраваную кампанію па ліквідацыі грамадскіх арганізацый у ліпені 2021 года. Цягам 2021 года былі ліквідаваныя або знаходзіліся ў працэсе прымусовай ліквідацыі 309 АГС. Акрамя таго, 194 арганізацыі грамадзянскай супольнасці, часта пад ціскам уладаў, вырашылі ліквідавацца самастойна. Прыпынілі сваю дзейнасць не толькі АГС, якія займаюцца адвакатаваннем і вострымі палітычнымі пытаннямі, але і сацыяльныя, культурныя і ўрбаністычныя арганізацыі. Кіраўнікі і супрацоўнікі

многіх ліквідаваных АГС мусілі бегчы з краіны, каб пазбегнуць арышту і катаванняў.

У шматлікіх выпадках ліквідацыі папярэднічалі агрэсіўныя праверкі міністэрства юстыцыі, падчас якіх ад АГС патрабавалі падаць амаль усе ўнутраныя дакументы. Многія АГС не змаглі прайсці гэтыя праверкі, паколькі іх кіраўнікі ўжо былі арыштаваныя, дакументы канфіскавала міліцыя, а супрацоўнікі не мелі доступу ў офісы арганізацый. Нароўні з праверкамі АГС улады дапытвалі і праводзілі падатковыя праверкі ў адносінах да звязаных с грамадскімі арганізацыямі грамадзян.

У 2021 годзе для падрыву аўтарытэту арганізацый грамадзянскай супольнасці ўлады абвінавачвалі іх у фінансавых парушэннях і ўхіленні ад выплаты падаткаў. У прыватнасці, сябраў праваабарончага цэнтра «Вясна» арыштавалі за ўхіленне ад выплаты падаткаў і дзеянні, якія парушаюць грамадскі парадак. Яны знаходзяцца за кратамі з ліпеня 2021 года. Адначасна ўлады правялі рэйды ў офісах АГС па ўсёй Беларусі. Амаль два дзясяткі асоб, звязаных з АГС, былі прыцягнутыя да адказнасці, дзясяткі іншых прайшлі праз допыты. АГС таксама пераследавалі па шэрагу артыкулаў Крымінальнага кодэкса, у тым ліку па артыкуле 361-1, у які ў 2021 годзе ўнеслі папраўкі і які прадугледжвае крымінальную адказнасць за «стварэнне экстрэмісцкага фарміравання або ўдзел у ім».

На працягу года многіх актывістаў грамадзянскай супольнасці затрымлівалі або прыцягвалі да крымінальнай адказнасці. Эдуард Бабарыка, лідар ліквідаванай краўдфандынгавай платформы MolaMola і сын альтэрнатыўнага кандыдата ў прэзідэнты Віктара Бабарыкі, утрымліваецца пад вартай без суду з сярэдзіны 2020 года. Хоць некалькіх затрыманых супрацоўнікаў арганізацый у канчатковым выніку вызвалілі з-пад варты ў 2021 годзе, многія іншыя актывісты АГС былі прыцягнутыя да крымінальнай адказнасці. Сярод іх былі Вольга Гарбунова (Радзіслава), Віктар Фянчук (Ахова птушак Бацькаўшчыны), Уладзімір Мацкевіч (філосаф і адзін з заснавальнікаў АГС «Лятучы ўніверсітэт» і «ЕЎраБеларусь») і Таццяна Кузіна (SYMPA).

21 снежня 2021 года парламент Беларусі прыняў закон, які аднавіў крымінальную адказнасць за арганізацыю або ўдзел у дзейнасці

незарэгістраваных АГС (артыкул 193-1 Крымінальнага кодэкса). Гэта норма была адмененая ў ліпені 2019 года ў выніку крытыкі з боку АГС і міжнародных арганізацый. Артыкул 193-1 прадугледжвае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам да двух гадоў і можа зноў стаць інструментам рэпрэсій супраць грамадзянскай супольнасці. Гэты артыкул пагражае як нефармальным ініцыятывам, так і стварае сур'ёзную рызыку крымінальнага пераследу сябраў АГС, якія былі пазбаўленыя рэгістрацыі.

У 2021 годзе таксама прынялі або пагоршылі яшчэ некалькі законаў, якія наўпрост уплываюць на працу АГС. Закон аб абароне персанальных дадзеных, які набыў моц ў лістападзе 2021 года, накладае строгія абавязацельствы і адказнасць на АГС як аператараў персанальных дадзеных. Закон патрабуе, каб аператары дадзеных атрымлівалі згоду фізічных асоб перад зборам і забяспечвалі ахову персанальных дадзеных. Аднак закон не вымагае згоды, калі АГС збірае дадзеныя для дасягнення сваіх статутных мэт і не распаўсюджвае іх. Такім чынам, Міністэрства юстыцыі парушае закон, калі патрабуе ад АГС падаць спіс сваіх сябраў, а затым выносіць папярэджанне за непаданне такога спісу або лічыць гэта падставай для ліквідацыі арганізацыі. На працягу года ўрад таксама пашырыў спіс звестак, якія АГС павінны публікаваць у адпаведнасці з правіламі справаздачнасці па барацьбе з адмываннем грошай і фінансаваннем тэрарызму. Грамадскія аб'яднанні і фонды цяпер павінны публікаваць звесткі аб сваіх замежных донарах і мерапрыемствах, а таксама пра журналістаў ці блогераў, якія наведваюць гэтыя мерапрыемствы.

У жніўні ўрад прыняў новы супярэчлівы закон «Аб супрацьдзеянні экстрэмізму», разлічаны на спыненне грамадзянскага ўдзелу і адкрытага распаўсюджвання інфармацыі. Спіс «экстрэмісцкіх» матэрыялаў, якія лічацца забароненымі, налічвае 200 старонак. У 2021 года сотні людзей арыштавалі за захоўванне кніг і фатаграфій, а таксама за публікацыю спасылак на папулярныя беларускія сайты і старонкі ў сацыяльных сетках, прызнаныя «экстрэмісцкімі».

У 2021 годзе палітыкі Беларусі разам з Міністэрствам юстыцыі абвясцілі аб планах прыняць спецыяльны закон «Аб грамадзянскай супольнасці» з мэтай паставіць гэты сектар пад поўны дзяржаўны кантроль. З афіцыйных заяў

вынікае, што гэты закон уключыць у паняцце «грамадзянская супольнасць» толькі арганізацыі, кантраляваныя ўрадам, такім чынам выключаючы незалежныя арганізацыі, якія з'яўляюцца сапраўднай грамадзянскай супольнасцю.

Арганізацыі грамадзянскай супольнасці маюць абмежаваны доступ да замежных ахвяраванняў. АГС могуць афіцыйна атрымліваць замежную дапамогу толькі на акрэслены спіс дапушчальных мэт і павінны рэгістраваць дапамогу ва ўрадзе, дадаткова аплаціўшы за гэта зборы. 8 лістапада 2021 года ў дэкрэт «Аб бязвыплатнай замежнай дапамозе» былі ўнесеныя папраўкі, якія дазваляюць залічыць да замежных донараў грамадзян Беларусі, якія знаходзіліся па-за межамі краіны больш за 183 дзён на працягу папярэдніх 12 месяцаў. Дэкрэт таксама класіфікуе любое ананімнае ахвяраванне на карысць АГС як замежную дапамогу, тым самым вымагаючы рэгістрацыю ахвяравання.

Грамадскім аб'яднанням забаронена займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю. Калі фонды або ўстановы займаюцца такой дзейнасцю, даход ад яе падлягае падаткаабкладанню па тых жа стаўках, што і даход звычайнага прадпрыемства. Умовы конкурсаў на выкананне дзяржаўнай сацыяльнай замовы звычайна не спрыяюць шырокаму ўдзелу АГС. Закон не прадугледжвае асаблівага статусу для арганізацый, якія маюць грамадскую карысць, або паняцця сацыяльнага прадпрымальніцтва.

АГС звычайна абкладаюцца тым жа падаткам, што і іншыя юрыдычныя асобы. Сяброўскія ўнёскі і ўнутраныя ахвяраванні вызваляюцца ад падаходнага падатку. Арганізацыі грамадзянскай супольнасці могуць падаць заяўку дзяржаве на вызваленне ад выплаты падаткаў на замежныя ахвяраванні, але такія запыты могуць быць часткова або цалкам адхіленыя. АГС таксама могуць прэтэндаваць на ўключэнне ў спіс арганізацый, якія Падатковы кодэкс цалкам вызваляе ад выплаты падаткаў. На сёння ў гэтым спісе ўсяго 17 АГС.

Падатковая сістэма не прадугледжвае стымулаў для аказання дабрачыннай дапамогі з боку прадпрыемстваў або прыватных асоб. Да таго ж, перадача ахвяравання неназванай у Падатковым кодэксе АГС часам разглядаецца органамі кантролю і падатковымі інспекцыямі як патэнцыйная рызыка, якая вымагае дадатковых праверак. Акрамя таго, ахвяраванні ад

карпаратыўных донараў павінны быць афармленыя пісьмовай дамовай з атрымальнікам.

Доступ арганізацый грамадзянскай супольнасці да прававой дапамогі ў 2021 годзе значна пагоршыўся. Усебаковае падаўленне грамадскай актыўнасці перашкаджала аказанню прававой дапамогі, паколькі арганізацыі па абароне правоў чалавека, якія традыцыйна аказваюць юрыдычныя паслугі, рэлакаваліся за мяжу. Улады ўзмацнілі гэтую праблему, заблакаваўшы доступ да некаторых прававых сайтаў з-за мяжы. Адначасна АГС, якія пераехалі і зарэгістраваліся за мяжой, часта адчувалі недахоп юрыдычнай дапамогі для разумення законаў, якія рэгулююць дзейнасць АГС у іншых краінах. Акрамя таго, многіх адвакатаў, якія працавалі па справах, звязаных з палітычна матываваным пераследам, пазбавілі ліцэнзіі, што яшчэ больш абмежавала доступ АГС да юрыдычнага прадстаўніцтва.

## АРГАНІЗАЦЫЙНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ: 5.1 (2020: 4.7)

Арганізацыйны патэнцыял сектара АГС у 2021 годзе надзвычайна пагоршыўся. У выніку зладжаных намаганняў урада па ліквідацыі незалежных АГС такія арганізацыі больш не могуць дзейнічаць легальна. Цягам года большасць АГС былі вымушаныя дбаць аб сваім арганізацыйным выжыванні, а не выжыванні.




У 2021 годзе складаныя ўмовы працы падарвалі здольнасць арганізацый грамадзянскай супольнасці будаваць і падтрымліваць адносіны са сваімі мэтавымі групамі і валанцёрамі. Многія арганізацыі спынілі актыўныя зносіны з мэтавымі групамі і закрылі свае сайты і старонкі ў сацыяльных сетках з-за боязі прыцягнуць непажаданую ўвагу. Некаторыя ліквідаваныя АГС аднавілі сваю дзейнасць пад новымі назвамі, што знізіла іх бачнасць і пазнавальнасць

сярод мэтавай аўдыторыі. Колькасць публічных мерапрыемстваў АГС таксама значна скарацілася.

Стратэгічнае планаванне стала для грамадскіх арганізацый адным з галоўных выклікаў. 50 з 62 арганізацый, якія ўдзельнічалі ў апытанні, праведзеным SYMPA вясной 2021 года, адзначылі, што доўгатэрміновае планаванне немагчымае, а 38 заявілі, што рэалізацыя праектаў і планаў немагчымая з-за нестабільных умоў, у якіх даводзіцца дзейнічаць. Акрамя таго, 51 рэспандэнт поўнасцю або часткова пагадзіўся з тым, што арганізацыі, якія яны прадстаўляюць, былі вымушаныя адмовіцца ад доўгатэрміновых планаў на «нявызначаны перыяд часу». У другой палове 2021 года большая частка арганізацый адзначылі, што ўжо вызначылі стратэгію на два-тры гады наперад.

Складаныя ўмовы таксама адмоўна паўплывалі на ўнутраныя працэсы кіравання АГС. Арганізацыі лічылі прыярытэтам бяспеку сваіх сябраў і супрацоўнікаў, а не адкрытую і празрыстую дзейнасць. Некаторыя АГС сутыкнуліся з цяжкасцямі падчас склікання агульных сходаў і выбараў кіруючых органаў, прадугледжаных статутнымі працэдурамі. Такія АГС часта ў якасці надзвычайнай меры перадавалі пэўныя паўнамоцтвы кіруючых органаў выканаўчым структурам.

Многія прадстаўнікі АГС пакінулі Беларусь і пераехалі ў Грузію, Літву, Польшчу, Украіну і іншыя краіны. Супрацоўнікі АГС, якія засталіся ў Беларусі, працавалі ў надзвычай рызыкоўных умовах і сутыкаліся з ціскам і пагрозамі пераследу. Як адзначае даследаванне SYMPA, АГС часта не маглі знайсці супрацоўнікаў з-за небяспекі, звязанай з даручэннем новым калегам канфідэнцыйных задач або перадачай уразлівай інфармацыі ў існуючых умовах. У іншых выпадках супрацоўнікі АГС выходзілі з арганізацый і ўладкоўваліся ў камерцыйным сектары або на іншыя пасады ў Беларусі ці за мяжой. Супрацоўнікі, што знаходзяцца за межамі краіны, часта не маюць статусу штатнага работніка і таму таксама працуюць у стане нявызначанасці.

Тэхнічнае забеспячэнне АГС у 2021 годзе значна пагоршылася з-за канфіскацыі ноўтбукаў, смартфонаў, жорсткіх дыскаў і іншых прылад падчас вобшукаў у офісах арганізацый і кватэрах іх прадстаўнікоў.

Нават неканфіскаванае офіснае абсталяванне ў шматлікіх выпадках заставалася ў апячатаных офісах, да якіх АГС не мелі доступу. У 2021 годзе арганізацыі грамадзянскай супольнасці працягвалі прымаць меры па забеспячэнні сваёй лічбавай бяспекі: стваралі стандарты і працэдуры бяспекі, шыфравалі прылады і пераходзілі на бяспечныя праграмы для камунікацыі і захавання інфармацыі.

## ФІНАНСАВАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ: 6,6 (2020: 6.4)

Беспрэцэдэнтны ціск на беларускія АГС у 2021 годзе сур'ёзна аслабіў іх фінансавую ўстойлівасць, паколькі абмежаванні знізілі здольнасць АГС да дыверсіфікацыі крыніц фінансавання і падарвалі фінансавую інфраструктуру арганізацый.

ФІНАНСАВАЯ ЎСТОЙЛІВАСЦЬ У БЕЛАРУСІ




Цягам года ўлады замарозілі банкаўскія рахункі многіх арганізацый грамадзянскай супольнасці. Напрыклад, Следчы камітэт (СК) замарозіў банкаўскі рахунак арганізацыі «Імёны», які сабраў больш за 545 000 долараў ЗША на падтрымку дабрачынных праектаў, у тым ліку дапамогу невылечна хворым дзецям у хоспісах.

Акрамя таго, як адзначалася вышэй, многія АГС і актывісты цягам года праходзілі фінансавыя праверкі і былі вымушаны падаваць фінансавыя справаздачы ў праваахоўныя органы і органы фінансавага кантролю. Гэтыя праверкі выкарыстоўваліся для запалохвання і пераследу арганізацый і актывістаў. Да таго ж, вынікі праверак станавіліся падставай для закрыцця АГС і крымінальнага пераследу іх сябраў.

Крымінальныя абвінавачванні супраць кіраўнікоў АГС часта былі звязаныя з іх фінансавай дзейнасцю. Напрыклад, улады распачалі крымінальныя справы супраць асоб, якія аказвалі фінансавую падтрымку рэпрэсаваным актывістам. Так, Упраўленне СК па Мінску прыцягнула да

адказнасці сузаснавальнікаў фондаў BY_help і BYSOL Аляксея Лявончыка і Андрэя Стрыжака за выплату штрафаў пратэстоўцам. Прадстаўнікі Праваабарончага цэнтра «Вясна» падвергліся крымінальнаму пераследу па абвінавачванні ва ўхіленні ад выплаты падаткаў.

Масавае пазбаўленне АГС рэгістрацыі абмежавала іх доступ да рэсурсаў, паколькі незарэгістраваным арганізацыям у Беларусі забаронена ажыццяўляць любую дзейнасць, у тым ліку збор сродкаў. Многія арганізацыі грамадзянскай супольнасці былі вымушаныя адмовіцца ад фандрэйзінгавай дзейнасці, якая атрымала шырокае распаўсюджванне ў апошнія гады, напрыклад, збор сродкаў праз сайты арганізацый, сэрвісы анлайн-плацяжоў і скрыні для ахвяраванняў. Здольнасць АГС збіраць сяброўскія ўнёскі таксама пагоршылася. Масавае пазбаўленне рэгістрацыі арганізацый грамадзянскай супольнасці і ціск з боку ўрада на бізнес таксама значна скарацілі падтрымку грамадзянскай супольнасці з боку бізнесу. Такое рэзкае зніжэнне даступнасці ўнутранага фінансавання абмежавала магчымасці АГС па дыверсіфікацыі крыніц фінансавання, у выніку чаго яны сталі яшчэ больш залежнымі ад замежных донараў.

Урад таксама абмежаваў доступ АГС да замежнага фінансавання. Грамадзяне Беларусі, якія знаходзяцца за межамі краіны, і ананімныя ахвяравальнікі былі залічаныя да замежных донараў, а ў рэгістрацыі замежнай дапамогі большасці некамерцыйных арганізацый улады адмовілі, у тым ліку тым, якія раней не мелі з гэтым праблем. Адначасна многія міжнародныя донары, арганізацыі і інстытуты працягвалі падтрымліваць беларускія арганізацыі грамадзянскай супольнасці як унутры краіны, так і за яе межамі, а некаторыя нават павялічылі сваю падтрымку. Большасць замежнага фінансавання Беларусі зараз размяркоўваецца сярод незалежных ад дзяржавы арганізацый.

Колькасць арганізацый грамадзянскай супольнасці, якіяякія маюць магчымасць арэндаваць памяшканні па льготнай стаўцы, скарацілася са 195 на канец 2020 года да 23 на канец 2021 года. Зняслаўленне АГС, іх масавая ліквідацыя і іншыя формы ціску не спрыялі развіццю сацыяльна адказнага бізнесу і сістэмы дзяржаўнай сацыяльнай дамовы.

У 2021 годзе ад беларускіх грамадскіх аб'яднанняў і фондаў сталі патрабаваць публікацыі пашыраных звестак аб усіх даходах і выдатках у адпаведнасці з законам «Аб мерах па прадухіленні легалізацыі даходаў, атрыманых злачынным шляхам, фінансавання тэрарыстычнай дзейнасці і фінансавання распаўсюджвання зброі масавага паражэння». Неабходнасць прытрымлівацца гэтага патрабавання абцяжарыла нагрузку на сістэмы фінансавага кіравання АГС. Акрамя таго, нават нязначныя недахопы ў фінансавых справаздачах станавіліся падставай для прызначэння буйных штрафаў і ліквідацыі АГС. Да таго ж, масавы пераезд беларускіх грамадскіх дзеячаў і рэгістрацыя арганизацый за межамі Беларусі значна ўскладнілі працэсы фінансавага кіравання АГС.

## АДВАКАТАВАННЕ: 5.8 (2020: 5.3)




У 2021 годзе адвакатыўная дзейнасць АГС рэзка скарацілася. Палітычны крызіс у Беларусі і глыбокая палярызацыя ў грамадстве не пакінулі АГС прасторы для вядзення адвакатыўных дзеянняў. Акрамя таго, Беларусь выйшла з Усходняга партнёрства (УП). Паколькі Беларусь больш не з'яўляецца сябрам УП, чыноўнікі не ўдзельнічаюць у гэтай дыялогавай платформе, тым самым пазбаўляючы прадстаўнікоў АГС важнай магчымасці для адвакатавання.

У выніку змен у заканадаўстве і практыцы яго прымянення, у тым ліку тых законаў, што прадугледжваюць крымінальную адказнасць за арганізацыю і ўдзел у дзейнасці незарэгістраванай арганізацыі, у 2021 годзе АГС стала небяспечна займацца адвакатаваннем — нават датычна непалітычных пытанняў. Напрыклад, у снежні 2021 года дырэктара сельскага дома культуры ў Пінскім раёне двойчы судзілі за яго кампанію па захаванні дрэў на грамадскіх могілках і пакаралі трыццаццю суткамі адміністрацыйнага арышту за «непадпарадкаванне загаду службовай асобы».

У 2021 годзе ў арганізацый грамадзянскай супольнасці амаль не было магчымасцей афіцыйна ўзаемадзейнічаць з дзяржаўнымі органамі. Улады не клапаціліся публікацыяй важных законапраектаў на афіцыйным прававым партале для грамадскага абмеркавання, а апублікаваныя законапраекты часам заставаліся зусім без каментарыяў. Нават арганізацыі грамадзянскай супольнасці, якія раней займаліся аглядам галіновых законапраектаў, на працягу года не атрымалі магчымасці зрабіць гэтага. Нефармальныя каналы сувязі АГС з чыноўнікамі былі таксама абмежаваныя.

Значна скарацілася колькасць калектыўных петыцый, пададзеных праз платформу Petitions.by: з 730 у 2020 годзе да 400 у 2021 годзе. Гэтая тэндэнцыя сведчыць аб тым, што многія беларусы, у тым ліку прадстаўнікі АГС, страцілі веру ў эфектыўнасць адвакатыўных дзеянняў.

Рэдкім прыкладам адвакатавання ў 2021 годзе стала выступленне арганізацый па абароне дзікай прыроды за новы закон аб абароне жывёлаў, які атрымаў палітычную падтрымку на высокім узроўні ад Аляксандра Лукашэнкі і дэпутаткі Марыі Васілевіч. Гэтыя арганізацыі грамадзянскай супольнасці правялі кампанію з заклікам пісаць лісты ў адпаведныя органы, сустракаліся з афіцыйнымі асобамі і прывозілі рэгіянальных дэпутатаў на станцыі кантролю за жывёламі. Нягледзячы на гэтыя мерапрыемствы, цягам года закон не быў прыняты.

Цягам 2021 года паміж Беларуссю і ЕС пагоршыўся памежны крызіс, падчас якога некалькі дзясяткаў тысяч мігрантаў, у асноўным з Блізкага Усходу, спрабавалі выехаць з Беларусі ў Літву, Латвію і Польшчу. Крызіс пачаўся ў ліпені, калі Аляксандр Лукашэнка прыгразіў скіраваць у ЕС паток «гандляроў людзьмі, кантрабандыстаў наркотыкаў і ўзброеных мігрантаў». Прынамсі 24 чалавекі загінулі пры спробе перайсці мяжу. Падчас гэтага крызісу ўрад узаемадзейнічаў з антыліберальнымі і папулісцкімі арганізацыямі грамадзянскай супольнасці. Напрыклад, арганізацыі «Адкрытыя сэрцы» і «Сістэмная праваабарона» падавалі сітуацыю выключна як гуманітарны крызіс, ігнаруючы адказнасць Лукашэнкі за яго глыбінныя прычыны.

Улічваючы сур'ёзныя абмежаванні адвакатыўнай дзейнасці ў Беларусі, многія АГС засяродзіліся на міжнародным адвакатаванні. Напрыклад, беларускія праваабаронцы адвакатавалі праз Спецыяльнага дакладчыка ААН па сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі і місію па расследаванні абставін парушэння правоў у Беларусі, арганізаваную Упраўленнем ААН па правах чалавека. Сумесна з іншымі арганізацыямі грамадзянскай супольнасці Беларускі Хельсінкскі камітэт падрыхтаваў альтэрнатыўны даклад для Камітэта ААН па эканамічных, сацыяльных і культурных правах, а Беларускі нацыянальны моладзевы савет «РАДА» накіраваў у гэты орган альтэрнатыўны даклад аб правах моладзі ў Беларусі.

## АКАЗАННЕ ПАСЛУГАЎ: 5.3 (2020: 5.0)




У 2021 годзе на аказанне паслугаў АГС аказалі ўплыў працяглая пандэмія COVID-19 і ўзмацненне рэпрэсій супраць грамадзянскай супольнасці.

З-за прымусовай ліквідацыі ў 2021 годзе многія арганізацыі грамадзянскай супольнасці спынілі аказанне паслуг. Напрыклад, вядомая арганізацыя, якая працавала з людзьмі з інваліднасцю, мусіла спыніць сваю дзейнасць па ўсёй Беларусі. У Барысаве ліквідавалі грамадскую асацыяцыю, якая займаецца праблемамі бытавога гвалту і людзей сталага ўзросту, а арганізацыя па абароне правоў жанчын закрыла сваю гарачую лінію для жанчын, якія пацярпелі ад хатняга гвалту. Некаторыя паслугі АГС аказаліся пад сур'ёзнай пагрозай у выніку гэтых змен.

Паслугі, даступныя ў Беларусі ў 2021 годзе, аказваліся галоўным чынам анлайн або ў гібрыдным фармаце. Арганізацыі грамадзянскай супольнасці распрацавалі віртуальныя навучальныя курсы і лекцыі па грамадзянскай адукацыі, самадапамозе, развіццю гарадскіх супольнасцей і іншых тэмах. Некаторыя АГС аказвалі паслугі з дапамогай аўтаматызаваных чат-ботаў, у тым

ліку чат-бота «Зварот» для вырашэння праблем у сельскай мясцовасці і чат-бота па ахове прыроды «Зялёны тэлефон». Падкасты таксама сталі папулярным медыя-фарматам сярод АГС. Культурныя мерапрыемствы, якія нельга было правесці фізічна, праводзіліся анлайн, у тым ліку выступы тэатральнай групы “Купалаўцы”, анлайн-фестываль «Артысты перамогі» і курсы беларускай мовы. Арганізацыі грамадзянскай супольнасці таксама прапаноўвалі шырокі спектр паслуг па падтрымцы палітычных зняволеных і іх сем'яў.

Рост прапановы анлайн-паслуг паўплываў на склад людзей, якія атрымлівалі паслугі. Некаторыя групы, напрыклад, людзі сталага веку або жыхары сельскай мясцовасці, не змаглі скарыстацца анлайн-інструментамі з-за абмежаванага доступу да Інтэрнэту або адсутнасці тэхнічных навыкаў. Некаторыя паслугі, такія як анлайн-кансультацыі па пытаннях навакольнага асяроддзя, аказваліся галоўным чынам маладым людзям. Раней па асабістыя і тэлефонныя кансультацыі звярталіся больш сталыя кліенты. Арганізацыі грамадзянскай супольнасці, якія працуюць з уразлівымі групамі, у тым ліку людзьмі з інваліднасцю, працягвалі аказваць паслугі ў фармаце асабістых спатканняў, калі было немагчыма прапанаваць анлайн-паслугі.

На працягу года зносіны сэрвісных арганізацый грамадзянскай супольнасці са сваімі мэтавымі групамі станавілася ўсё больш абмежаваным. Некамерцыйныя арганізацыі не маглі рэкламаваць свае паслугі ў дзяржаўных сродках масавай інфармацыі. Тым часам незалежныя СМІ закрылі або абвясцілі «экстрэмісцкімі фарміраваннямі». АГС працягвалі мець зносіны са сваімі мэтавымі групамі праз сацыяльныя сеткі, часта ў закрытых (непублічных) фарматах, шмат якія ліквідаваныя арганізацыі закрылі свае сайты і старонкі ў сацсетках. Палітычны крызіс таксама выклікаў зніжэнне яўнага попыту на некаторыя паслугі, паколькі людзі баяліся звяртацца ў арганізацыі грамадзянскай супольнасці, асцерагаючыся рэпрэсій. Абмежаваны доступ да мэтавых груп аслабіў здольнасць АГС да вызначэння патрэбаў сваіх кліентаў.

Адначасна, у адказ на рэпрэсіі сектар АГС распрацаваў праграмы па самазахаванні. Арганізацыі грамадзянскай супольнасці аказвалі паслугі па падтрымцы праваабаронцаў, журналістаў, актывістаў і работнікаў культурнага

сектара. АГС прапаноўвалі юрыдычныя кансультацыі, псіхалагічныя паслугі, мерапрыемствы па развіцці патэнцыялу, стваралі прытулкі і арганізоўвалі стажыроўкі. Каб выявіць зменлівыя патрэбы АГС, цягам года было праведзена некалькі даследаванняў сектара, напрыклад, распрацаванае арганізацыяй SYMPA. Большасць з гэтых паслуг аказваліся арганізацыямі грамадзянскай супольнасці за межамі краіны, але прызначаліся для людзей і арганізацый, якія засталіся ў Беларусі.

У краінах, куды пераехалі беларусы, АГС аказвалі паслугі новай мэтавай групе: беларусам за мяжой. АГС адкрывалі цэнтры падтрымкі, хабы для развіцця ініцыятыў, а таксама інтэграцыйныя і беларускія культурныя праграмы, напрыклад, Беларуская нядзельная школка для дзяцей у Вільні.

Унутры Беларусі магчымасці АГС для кампенсацыі выдаткаў былі моцна абмежаваныя з-за пераважна анлайнавага рэжыму працы і прававога статусу груп грамадзянскай супольнасці, бо ліквідаваныя АГС і АГС, у адносінах да якіх вялося следства, не маглі атрымліваць плацяжоў і ахвяраванняў. Некаторыя арганізацыі грамадзянскай супольнасці атрымалі частковую кампенсацыю за аказанне паслуг, якая дазволіла ім аказваць пэўныя паслугі, напрыклад, арганізацыі, што прапаноўвалі беларускую адукацыю для дарослых і дзяцей і каворкінгі за мяжой.

Улады што мясцовага, што нацыянальнага ўзроўню не прызнаюць каштоўнасці сацыяльных паслуг, прапанаваных АГС. Спробы АГС маніторыць аказанне такіх паслуг дзяржавай былі расцэненыя як экстрэмісцкія дзеянні і пераследваліся па законе.

## ІНФРАСТРУКТУРА СЕКТАРА: 5.3 (2020: 5.0)

Надзвычай неспрыяльныя ўмовы, з якімі сутыкнулася беларуская грамадзянская супольнасць у 2021 годзе, моцна падарвалі інфраструктуру, што падтрымлівае гэты сектар.

Большасць пасрэдніцкіх арганізацый, скіраваных на падтрымку сектара, тэматычных структур і парасонавых арганізацый, згаданых у папярэдніх справаздачах, у 2021 годзе былі прымусова ліквідаваныя. Некаторыя

арганізацыі працягвалі падтрымліваць беларускія АГС і актывістаў з-за мяжы — анлайн і з дапамогай сустрэч і трэнінгаў у трэціх краінах. Шэраг парасонавых і інфраструктурных арганізацый грамадзянскай супольнасці наогул спынілі сваю дзейнасць. Некалькі пасярэдніцкіх арганізацый працягнулі актыўнасць, але толькі непублічна.

ІНФРАСТРУКТУРА СЕКТАРА Ў БЕЛАРУСІ




Негатыўны ўплыў на АГС у Беларусі, асабліва ў рэгіёнах, аказала закрыццё месцаў, дзе яны маглі б арганізоўваць мерапрыемствы і сустрэчы. Адначасна беларускія арганізацыі грамадзянскай супольнасці стваралі падобныя пляцоўкі ў краінах, куды яны пераехалі.

Мясцовыя магчымасці выдзялення грантаў у Беларусі заўсёды былі абмежаваныя, а ў 2021 годзе дадаткова пагоршыліся. На працягу года некалькі беларускіх грамадскіх арганізацый абвяшчалі грантавыя конкурсы, але інфармацыю пра іх распаўсюджвалі па закрытых каналах. Няўрадавая арганізацыя «Узаемаразуменне», якая падтрымлівае праекты для людзей, што пацярпелі ад нацысцкага рэжыму ў Германіі, і выкарыстоўвае фінансаванне нямецкага Фонда EVZ, заставалася адной з нямногіх адкрытых і легальных нацыянальных рэгрантынгавых праграм для арганізацый грамадзянскай супольнасці.

У 2021 годзе сярод найбольш папулярных адукацыйных тэм для АГС былі фізічная і лічбавая бяспека, прадухіленне эмацыйнага выгарання і кіраванне праектамі. Існавала відавочная неабходнасць у развіцці базавых кампетэнцый новых актывістаў і ініцыятыўных груп у галіне арганізацыйнага кіравання і праектнага мэнэджмента. Беларускі нацыянальны моладзевы савет «РАДА» арганізаваў некалькі навучальных курсаў для моладзевых грамадскіх арганізацый і актывістаў, у тым ліку анлайн-курс па кіраванні арганізацыяй падчас крызісу, школу візуальнага мастацтва RADAvisual і курс Youthink па развіцці навыкаў, якія могуць спатрэбіцца ў будучыні.

У пачатку 2021 года большасць адукацыйных праграм прапаноўвалася анлайн. У другой палове года многія мерапрыемствы арганізоўваліся ў афлайн фармаце. Арганізатары трэнінгаў у Беларусі і за мяжой сутыкаліся са значнымі рызыкамі і праблемамі. У Беларусі колькасць вопытных трэнераў і экспертаў па арганізацыйным развіцці рэзка скарацілася, паколькі яны пераехалі ў іншыя краіны. Запрашэнне ўдзельнікаў з Беларусі на мерапрыемствы ў іншых краінах ускладнялася абмежаваннямі, звязанымі з перасячэннем мяжы, і мерамі па барацьбе з COVID-19 у адносінах да падарожнікаў у іншых дзяржавах. На працягу года Грузія была самай даступнай краінай для арганізацыі мерапрыемстваў з удзелам людзей з Беларусі.

У 2021 годзе паўстала вострая неабходнасць у падтрымцы перасялення актывістаў і арганізацый з Беларусі за мяжу. Такую падтрымку аказаў у тым ліку Беларускі Дом правоў чалавека ў Літве.

Нягледзячы на прымусовую ліквідацыю шэрага афіцыйных структур і парасонавых арганізацый у Беларусі, АГС працягвалі супрацоўнічаць паміж сабой, часта на нефармальным узроўні. Напрыклад, арганізацыі грамадзянскай супольнасці сфармавалі кааліцыі для арганізацыі такіх мерапрыемстваў, як Тыдзень нулявой дыскрымінацыі і Тыдзень супраць катаванняў. Некалькі кааліцый АГС, створаных у папярэднія гады, працягвалі сваю дзейнасць, адначасна ўзнікалі новыя кааліцыі. Асабліва трэба адзначыць партнёрства ByNGO, якое аб'ядноўвае сем арганізацый грамадзянскай супольнасці, скіраваных на аказанне падтрымкі беларускім АГС і абароне іх правоў незалежна ад іх месцазнаходжання.

У 2021 годзе міжсектаральныя партнёрствы амаль не ствараліся. Беларускія арганізацыі грамадзянскай супольнасці практычна не мелі адносін з дзяржаўнымі органамі, а супрацоўніцтва паміж АГС і дзелавым сектарам скарацілася з-за рэпрэсій і рызыкі для бізнесу, якую нясе супрацоўніцтва з ліквідаванымі АГС.

## ГРАМАДСКІ ІМІДЖ: 5.5 (2020: 5.2)

Грамадскі імідж сектара АГС значна сапсаваўся ў 2021 годзе.

Асвятленне дзейнасці АГС у сродках масавай інфармацыі скарацілася, бо многія незалежныя выданні былі ліквідаваныя або абвешчаныя «экстрэмісцкімі». Некаторыя арганізацыі грамадзянскай супольнасці пазбягалі публікацый аб сваёй дзейнасці ў сродках масавай інфармацыі, каб не прыцягваць непажаданай увагі.




Арганізацыі грамадзянскай супольнасці — і тыя, што працягвалі працаваць у Беларусі, і тыя, што пераехалі за мяжу, але чые супрацоўнікі (цяперашнія або былыя) заставаліся ў краіне — таксама публікавалі менш інфармацыі аб сваёй дзейнасці на сваіх старонках праз страх рэпрэсій. З сайтаў АГС выдаляліся звесткі пра прадстаўнікоў арганізацый. Шэраг сайтаў былі заблакаваныя ўладамі, адначасна частка арганізацый перастала абнаўляць або самастойна закрыла свае сайты. Многія АГС правялі рэбрэндынг у сацыяльных сетках. Арганізацыі грамадзянскай супольнасці перасталі публікаваць справаздачы аб сваёй дзейнасці або распаўсюджвалі іх толькі сярод даверaных партнёраў і донараў.

Адначасна некаторыя арганізацыі грамадзянскай супольнасці, што працуюць з-за мяжы, развілі свае каналы камунікацыі ў сацыяльных сетках. Напрыклад, у Тэлеграм-канала Праваабарончага цэнтра «Вясна» было больш за 13 000 падпісантаў. Новыя арганізацыі грамадзянскай супольнасці таксама стварылі ўласныя каналы ў Telegram і YouTube.

Дзяржаўныя СМІ ў 2021 годзе вялі прапагандысцкую кампанію супраць грамадзянскай супольнасці. Напрыклад, прапагандыст Андрэй Мукавозчык атакаваў АГС у праўладнай газеце. Адной з правакацыйных заяў стала выказванне: «Беларусь моцна засеяна пустазеллем «грамадзянскай

супольнасці». АГС, якія атрымліваюць замежнае фінансаванне, вызналі асаблівую стыгматызацыю. На працягу года дзяржаўныя СМІ публікавалі або транслявалі шматлікія гісторыі пра тое, як АГС здзяйсняюць фінансавыя злачынствы, ухіляюцца ад выплаты падаткаў і фінансуюць пратэсты за кошт замежных грантаў, у тым ліку гісторыі аб нямэтавым выкарыстанні сродкаў краінавым аддзяленнем ААН у Беларусі. Арганізацыі грамадзянскай супольнасці таксама крытыкаваліся і на праўладных YouTube і Тэлеграм-каналах, напрыклад, «Харакіры» і «Жоўтыя слівы». АГС, якія атрымліваюць фінансаванне ад дзяржавы, таксама ўдзельнічалі ў прапагандысцкіх кампаніях, выступалі ў падтрымку палітыкі ўрада і абражалі іншыя арганізацыі грамадзянскай супольнасці.

Рэпрэсіі негатыўна паўплывалі на дакладнасць вынікаў апытанняў грамадскіх меркаванняў у Беларусі, а дзяржаўная прапаганда, скіраваная супраць АГС, мэтанакіравана спрыяла фарміраванню больш негатыўнага вобраза грамадзянскай супольнасці сярод прыхільнікаў рэжыму. Тым не менш, паводле апытання ініцыятывы Chatham House Belarus, на канец 2021 года АГС, у прыватнасці, незалежныя праваабарончыя арганізацыі і прафсаюзы былі сярод інстытутаў, якія карыстаюцца найбольшым даверам у беларускім грамадстве. Пры гэтым адзінымі структурамі са станоўчым узроўнем даверу, разлічаным як розніца паміж узроўнямі даверу і недаверу, былі АГС, непадкантрольныя дзяржаве. Узровень даверу да незалежных СМІ дасягнуў 17%, незалежныя праваабарончыя арганізацыі і незалежныя прафсаюзы атрымалі 15%, Праваслаўная царква — 5%. Афіцыйныя прафсаюзы і дзяржаўныя СМІ, мелі адмоўны ўзровень даверу: -22% і - 43% адпаведна.

**U.S. Agency for International Development**

1300 Pennsylvania Avenue, NW
Washington, DC 20523
Tel: (202) 712-0000
Fax: (202) 216-3524

**www.usaid.gov**